## Лічэбнік
## (Numerale)

Лацінскія лічэбнікі (*numeralia*) падзяляюцца на колькасныя (*cardinalia*), парадкавыя (*ordinalia*), раздзяляльныя (*distributīva*) і прыслоўныя (*adverbia*).

**Зводная табліца лічэбнікаў**

| Лічбавая адзнака | | Cardinalia | Ordinalia |
|---|---|---|---|
| арабская | рымская | | |
| 1 | I | unus, a, um — *адзін* | primus, a, um — *першы* |
| 2 | II | duo, duae, duo — *два, дзве* | secundus, a, um<br>alter, ĕra, ĕrum — *другі* |
| 3 | III | tres, tria | tertius, a, um |
| 4 | IV | quattuor | quartus |
| 5 | V | quinque | quintus |
| 6 | VI | sex | sextus |
| 7 | VII | septem | septĭmus |
| 8 | VIII | octo | octāvus |
| 9 | IX | novem | nonus |
| 10 | X | decem | decĭmus |
| 11 | XI | undĕcim | undecĭmus |
| 12 | XII | duodĕcim | duodecĭmus |
| 13 | XIII | tredĕcim | tertius decĭmus |
| 14 | XIV | quattuordĕcim | quartus decĭmus |
| 15 | XV | quindĕcim | quintus decĭmus |
| 16 | XVI | sedĕcim | sextus decĭmus |
| 17 | XVII | septendĕcim | septĭmus decĭmus |
| 18 | XVIII | duodeviginti | duodevicesĭmus |
| 19 | XIX | undeviginti | undevicesĭmus |
| 20 | XX | viginti | vicesĭmus |
| 21 | XXI | unus et viginti або<br>viginti unus і г. д. | primus et vicesĭmus або<br>vicesĭmus primus і г. д. |
| 28 | XXVIII | duodetriginta | duodetricesĭmus |
| 29 | XXIX | undetriginta | undetricesĭmus |
| 30 | XXX | triginta | tricesĭmus |
| 40 | XL | quadraginta | quadragesĭmus |
| 50 | L | quinquaginta | quinquagesĭmus |
| 60 | LX | sexaginta | sexagesĭmus |
| 70 | LXX | septuaginta | septuagesĭmus |
| 80 | LXXX | octoginta | octogesĭmus |
| 90 | XC | nonaginta | nonagesĭmus |
| 100 | C | centum | centesĭmus |
| 200 | CC | ducenti, ae, a | ducentesĭmus |
| 300 | CCC | trecenti, ae, a | trecentesĭmus |
| 400 | CD | quadringenti, ae, a | quadringentesĭmus |
| 500 | D | quingenti, ae, a | quingentesĭmus |
| 600 | DC | sescenti, ae, a | sescentesĭmus |
| 700 | DCC | septingenti, ae, a | septingentesĭmus |
| 800 | DCCC | octingenti, ae, a | octingentesĭmus |
| 900 | CM | nongenti, ae, a | nongentesĭmus |
| 1000 | M | mille | millesĭmus |
| 2000 | MM | duo milia | bis millesĭmus |

| Distributīva | Adverbia |
|---|---|
| singŭli, ae, a — *па адным* | semel — *адзін раз, аднаразова* |
| bini, ae, a — *па два, па двое* | bis — *двойчы, два разы* |
| terni (trini), ae, a | ter |
| quaterni, ae, a | quater |
| quini, ae, a і г. д. | quinquies і г. д. |

Усе лічэбнікі, якія могуць змяняцца па родах, ліках і склонах, дапасуюцца да назоўнікаў: duo consŭles — *два консулы*; duae legiōnes — *два легіёны*; tres species — *тры віды*; tria genĕra — *тры роды*; tribus verbis — *у трох словах*. Лічэбнік mille — *тысяча* не змяняецца і не ўплывае на склон назоўніка: mille milĭtes — *тысяча салдат* і г. д. Толькі слова milia — *тысячы* (pl. ад mille) патрабуе пасля сябе genetīvus: tria milia milĭtum — *тры тысячы салдат*, бо ўжываецца як назоўнік.

У складаных парадкавых лічэбнікаў скланяюцца ўсе элементы, а не толькі апошні, як гэта прынята ў беларускай мове (параўн.: vicesĭmus secundus — *дваццаць другі*). Напрыклад: anno millesĭmo nongentesĭmo quinquagesĭmo sexto — *у тысяча дзевяцьсот пяцьдзясят шостым годзе*.

Лічэбнікі другога дзясятка ўтвараюцца шляхам складання каранёў адзінак са словам **-dĕcim** (ад decem), напрыклад: XI (11) undĕcim; дзясяткі ад 30 да 90 утвараюцца з дапамогай суфікса **-ginta**, напрыклад: L (50) quinquaginta. C (100) centum не скланяецца; сотні ўтвараюцца з дапамогай суфікса **-centi (-genti)** і змяняюцца па 1—2-м скланенні ў множным ліку (гл. § 23), напрыклад: CC (200) ducenti, ae, a; D (500) quingenti, ae, a. M (1000) mille у адзіночным ліку не скланяецца; тысячы ў множным ліку змяняюцца як назоўнікі 3-га галоснага скланення (гл. § 15): nom./acc. **milia**, gen. **milium**, dat./abl. **milĭbus**.

Рымскія лічбы важна ведаць, бо яны ўжываюцца для абазначэння частак дакументаў, дат і г. д. Напрыклад, год 1991 рымскімі лічбамі абазначаецца наступным чынам: MCMLXXXXI = MCMXCI, 2011 — MMXI.

**Скланенне колькасных лічэбнікаў**
**unus — *адзін*; duo — *два*; tres — *тры***

| Склон | Singulāris | | | Plurālis | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | m | f | n | m | f | n | m, f | n |
| Nom. | unus | una | unum | duo | duae | duo | tres | tria |
| Gen. | unīus | | | duōrum | duārum | duōrum | trium | |
| Dat. | uni | | | duōbus | duābus | duōbus | tribus | |
| Acc. | unum | unam | unum | duos | duas | duo | tres | tria |
| Abl. | uno | unā | uno | duōbus | duābus | duōbus | tribus | |